# Палескія даляглядЫ

## У Мазырскім краі шукаюць і знаходзяць падыход да кожнага

**Агульнавядомы факт: жадаеш пабачыць далей – узніміся вышэй. Узлезь на дрэва, узыдзі на гару, узляці да неба, урэшце. З вокнаў многіх службовых кабінетаў Мазыра адкрываецца цудоўны від на горад, на абшары Прыпяцкай нізіны, парослыя садамі і паркамі, на магутную, паўнаводную раку. Прыгажосць тут незвычайная, якую адчуваеш нават узімку, хоць мясцовыя жыхары настойваюць на тым, што з Мазыром знаёміцца лепей вясной ці летам. Нават дарогу, пракладзеную пакручастымі языкамі горнага серпанціну, на Беларусі я ўпершыню пабачыў тут. Пашанцавала гораду з месцазнаходжаннем! І падалося раптам, што менавіта горныя пейзажы, якія прымушаюць глядзець далей і шырэй, даюць магчымасць мясцовай уладзе бачыць больш глыбока, больш пранікнёна. Нездарма дасведчаныя людзі з Гомеля раілі ехаць па станоўчы вопыт ідэалагічнай работы менавіта сюды, у Мазыр.**

### МАЗЫРСКАЯ СІСТЭМА

Любімае слова начальніка аддзела ідэалагічнай работы Мазырскага райвыканкама Таццяны Ганчарэнка – сістэма. Прынамсі, у нашых з Таццянай Міхайлаўнай гутарках яно альбо вытворныя ад яго формы ўсплывалі штораз. Работа з людзьмі – сістэмная. Увага да зваротаў грамадзян – у сістэме. Дыялог з насельніцтвам – сістэматычны. Выхаванне падлеткаў і моладзі павінна, бы цаглінка да цаглінкі, складацца ў сістэму – ад дзіцячага садка і... да бясконцасці. Шчасце дзяцей залежыць ад здароўя сям'і, моц і дабрабыт сям'і – ад паводзін бацькоў, стыль жыцця бацькоў у значнай ступені вызначаецца наяўнасцю працы, адносінамі калег і суседзяў, грамадскай атмасферай, а таму ў сістэме клопату пра дзяцей нельга забывацца пра дарослых...

Гэты пералік можна доўжыць і доўжыць, бо сапраўды: ідэалагічная работа – не вектар ад нулявой кропкі ў светлую далеч, а клубок са светапоглядаў, уплываў, настрояў, праблем. Ёсць жаданне разматаць яго, дабіцца нечага сапраўды вартага – не цягні за адну нітачку, не торгай нецярпліва, бо заблытаеш яшчэ больш. Спакойна і мэтанакіравана, віток за вітком здымай слаі з клубка – і рана ці позна будзе, урэшце, вынік.



Сістэма, адным словам!

І сістэма ідэалагічнай работы ў раёне сапраўды створана і працуе, сілкуючыся як няўрымслівасцю Таццяны Ганчарэнка, так і ўвагай да гэтай справы з боку кіраўніцтва выканкама і абласной улады.

А Мазыршчына між тым – край для кіравання не просты. Не тыповы, так бы мовіць, для Беларусі гэты раён. Па колькасці сельскага насельніцтва – каля 20 тысяч чалавек – яго можна параўнаць з любым іншым беларускім рэгіёнам. Затое сам райцэнтр – гэта амаль 110 тысяч насельнікаў і мноства прадпрыемстваў, у тым ліку такія волаты прамысловасці, як ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» ці ААТ «Мазырсоль». А яшчэ ААТ «Беларускабель», ААТ «Мазырскі машынабудаўнічы завод», камбінат «Этанол», швейная фабрыка «Надэкс» і трыкатажная – «Славянка»... З аднаго боку, у чалавека тут менш праблем з працаўладкаваннем і большыя адлічэнні накіроўваюцца ў мясцовы бюджэт, затое з другога – высокія патрабаванні рабочага люду да прадстаўнікоў улады і належная арганізаванасць прафсаюзнага руху, моцныя грамадскія арганізацыі.

Нават сам горад-прыгажун для камунальнікаў, будаўнікоў, сувязістаў, міліцыі, сферы паслуг – аб'ект, які вымагае шмат сіл, сродкаў і клопатаў. Дастаткова адзначыць, што яго вуліцы разбегліся ўздоўж берагоў Прыпяці аж на 22 кіламетры, а ў межах Мазыра – тры самыя доўгія масты ў Беларусі.

Нарэшце, ці многа ёсць у нашай краіне раённых цэнтраў з уласным універсітэтам? А тут – вядомы не толькі ў Беларусі навукова і адукацыйны цэнтр Палесся Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна, колькасць студэнтаў якога на дзённай і завочнай формах навучання перасягае сёння 8 тысяч чалавек.

Можна ўявіць, колькі хаваецца нітачак і пластоў праблем і мэт ідэалагічнай работы ў тым клубку, які склаўся на Мазырскай зямлі. І як асцярожна і далікатна трэба працаваць з людзьмі ў такім рэгіёне.

Дарэчы, ходкія фразы, такія як «дайсці да кожнага», «выслухаць чалавека» і «адрэагаваць на зварот грамадзяніна», у дачыненні да ідэалагічнай работы ад частага выкарыстання іншы раз пачалі траціць свой першачарговы, глыбокі і зразумелы сэнс. На самай жа справе яны азначаюць толькі адно: кожны асобна ўзяты прадстаўнік грамадства не павінен сябе адчуваць у адзіноце, пакінутым, нікому не патрэбным. Калі чалавек зразумее, што пра яго праблемы ведаюць, клапоцяцца пра іх вырашэнне, калі ўбачыць, што дапамога з боку дзяржавы ў складаны момант будзе прапанавана, – гэта і будзе належным эквівалентам выканання патрабавання «дайсці да кожнага». У Мазыры ж гучных тэрмінаў стараюцца пазбягаць. Тут хутчэй згодзяцца абмеркаваць сістэму захадаў і метадаў, якая б дазволіла зрабіць так, каб ніхто не застаўся ўбаку, па-за ўплывам дзяржаўнай ідэалогіі.

Па праўдзе, я быў вельмі ўдзячны, калі Таццяна Міхайлаўна прапанавала абмежавацца знаёмствам толькі з нейкім адным кірункам ідэалагічнай работы ў раёне. Мы спыніліся на тым, каб паглядзець, як працуюць мясцовыя ідэалагічныя структуры з моладдзю: амаль палова насельнікаў раёна – 60 тысяч са 130 – гэта людзі ва ўзросце да 30 гадоў. А значыць, ва ўзросце фарміравання асобы і светапогляду – з аднаго боку, і найбольшай актыўнасці і бескампраміснасці – з другога.

З маладымі працаваць, вядома, цяжэй. І цікавей!

## ГАВАНЬ ВЕДАЎ І ДУХОЎНАСЦІ

Універсітэцкі гарадок месціцца ў самым цэнтры Мазыра, на высокім беразе Прыпяці. У карпусах – самае сучаснае вучэбна-метадычнае абсталяванне, вельмі багатая матэрыяльна-тэхнічная база – спецыяльныя прадметныя аўдыторыі, комплекс лабараторый і майстэрняў, інфармацыйна-вылічальны цэнтр, бібліятэка, спартыўныя залы... Універсітэт мае тры інтэрнаты і санаторый-прафілакторый для аздараўлення студэнтаў без адрыву ад вучобы.

У складзе ўніверсітэта 10 факультэтаў, 32 кафедры, дзе працуюць больш як 400 выкладчыкаў. На некаторых факультэтах кадры вышэйшай кваліфікацыі рыхтуюць магістратура і аспірантура.

Тры тысячы студэнтаў (калі не лічыць завочнікаў) штодзень прыходзяць сюды на заняткі. І «дзявочага царства», у адрозненне ад многіх іншых педагагічных устаноў, тут няма: каля 40 % студэнтаў – хлопцы з тэхнічных і фізкультурнага факультэтаў.

Старшыня Мазырскага райвыканкама Уладзімір Дворнік (злева) і кіраўнік Гомельшчыны Аляксандр Якабсон (справа) у час святкавання 855-годдзя Мазыра. Верасень 2010 года



Знаёмства з гэтай навучальнай установай прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях кандыдат педагагічных навук, дацэнт Сяргей Шчур прапанаваў пачаць з Цэнтра ідэалагічнай работы. Гэта прасторнае памяшканне з круглым сталом для правядзення дыспутаў, камп'ютарнай і мультымедыйнай тэхнікай. Ён быў створаны дзеля аптымізацыі ідэалагічнай работы са студэнцкай моладдзю, інфармацыйнага, навукова-метадычнага і арганізацыйнага забеспячэння ідэалагічнага і грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Сяргей Мікалаевіч відавочна ганарыцца Цэнтрам:

– Вакол Цэнтра арганізавана ўся наша работа. Тут рыхтуюцца аналітычныя матэрыялы да адзіных дзён інфармавання насельніцтва, якія мы распрацоўваем у цеснай сувязі з ідэалагічным аддзелам

райвыканкама. Тут адбываюцца семінары, сустрэчы адміністрацыі са студэнтамі і выкладчыкамі. Мы лічым, што трэба трымаць руку на пульсе студэнцкага жыцця, студэнцкага светаўспрымання. У час такіх сустрэч выяўляюцца праблемы, якія хвалююць моладзь. Занатоўваем, разбіраемся. І праз пэўны час абавязкова адказваем людзям, што можна вырашыць літаральна зараз, а што будзем планаваць на больш далёкую перспектыву. Гэта вельмі карысныя сустрэчы для абодвух бакоў.

У Цэнтры любому студэнту дадуць кансультацыю, у тым ліку па прававых пытаннях, пытаннях заканадаўства. Такім чынам, гаворыць Сяргей Шчур, ва ўніверсітэце створана паўнацэнная сістэма ідэалагічнай і інфармацыйнай работы.

Ізноў я пачуў пра сістэму!

Але ж сапраўды, што гэта, як не сістэма? Кіраўніцтва ВНУ добра разумее, што энергіі ў маладых людзей – праз край. І лепш скарыстаць яе, як кажуць, у мірных мэтах. Таму работа па вывучэнні схільнасцей і талентаў студэнтаў пачынаецца літаральна з першых дзён першакурсніка ў сценах альма-матар. І прапануюцца варыянты, чым у вольны час можа заняцца малады чалавек. Больш за 80 секцый і гурткоў створаны для студэнтаў. Напрыклад, Мазырскі ўніверсітэт заўсёды славіўся сярод ВНУ краіны выканаўцамі інструментальнай музыкі, а цяпер тут створаны яшчэ і ўніверсітэцкі хор.



Прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна Сяргей Шчур

Многіх студэнтаў прыцягвае валанцёрскі рух. Валанцёрства, дапамога тым, хто не можа без яе абысціся, – гэта, лічаць ва ўніверсітэце, поўнасцю адпавядае профілю педагагічнай ВНУ. Педагог павінен умець навучыць суперажыванню, а таму і сам мусіць быць з адкрытым сэрцам. Больш за 600 студэнтаў (пятая частка!) пастаянна ўдзельнічаюць у валанцёрскіх акцыях у Мазырскім цэнтры рэабілітацыі, у прытулку, дзіцячым доме, бываюць у кватэрах ветэранаў вайны і працы. А яшчэ клопат валанцёраў – месцы пахавання салдат, якія вызвалялі Мазыр, магілы былых супрацоўнікаў універсітэта, помнікі героям вайны.

Няма цягі да валанцёрства – можна заняцца спортам. Спорту, фізкультурнай падрыхтоўцы тут наогул надаецца шмат

## МЕРКАВАННЕ



**Фелікс ГАЛЮК, намеснік старшыні Мазырскага раённага выканаўчага камітэта:**

– Прадстаўнікі аддзела ідэалагічнай работы выканкама заўсёды актыўна працавалі ў калектывах. І не забываліся на тое, што ёсць Дырэктыва № 1, якая найперш скіравана на ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, на барацьбу з п'янствам і алкагалізмам.

Апошнім часам важкай дапамогай у рабоце ўлады з людзьмі стала актывізацыя дзейнасці назіральных камісій. Раней гэтыя камісіі былі, найчасцей, прэрагатывай органаў МНС. Яны наведвалі домаўладанцтвы, сем'і, якія знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы, звярталі ўвагу на выкананне правілаў процілажарнай бяспекі. У гэтым жа кірунку працавалі ўчастковыя інспектары міліцыі, органы адукацыі. Але паасобку і па сваіх, як кажуць, інтарэсах. А сёння ў нас створана і працуе цэлая сістэма. У першы чацвер месяца камісіі дзейнічаюць у горадзе, у трэці чацвер – у вёсках. У склад кожнай камісіі ўваходзяць супрацоўнік МНС, МУС, прадстаўнік сацыяльнай службы, органаў адукацыі. І абавязкова ў вёсках – старшыня сельсавета, а ў горадзе – кіраўнік жыллёва-эксплуатацыйнага ўчастка. Мазыр абслугоўваюць восем ЖЭУ – значыць, восем камісій адпраўляецца па кватэрах. І ў кожны сельсавет выязджае свая камісія.

У зоне ўвагі камісій – адзінокія і састарэлыя людзі, шматдзетныя сем'і, ветэраны вайны і працы, інваліды. І, вядома, грамадзяне з асацыяльнымі паводзінамі.

Кожны член камісіі адказвае за свой напрамак. Настаўнікі заўважаюць непарадак з выхаваннем ці здароўем дзяцей, прадстаўнік МНС – адсутнасць пажарнага паведамляльніка ці трэснуты комін, участковы – п'янства альбо гвалт у сям'і. Але самае галоўнае ў тым, што ад гэтай работы ёсць адчувальныя вынікі. Многія праблемы вырашаюцца аператыўна. Іншыя – трапляюць на кантроль да адказных асоб, таго ж старшыні сельсавета або начальніка ЖЭУ. І плён ад гэтай работы ёсць, бо яна вядзецца з людзьмі не на словах. А калі дапасаваць сюды дзейнасць інфармацыйных груп, створаных у раёне, то атрымліваецца, што мы аператыўна і якасна вырашаем многія з праблем, якія хвалююць людзей. Здавалася б, простыя захады,

але ж аказваюцца на дзіва эфектыўнымі, бо ў сваёй кватэры, у сваёй хаце чалавек можа расказаць тое, пра што не рашыўся б на сходзе жыхароў, напрыклад.

Атрымліваецца, што не чалавек ідзе да ўлады з просьбай, прапановай альбо скаргай, а ўлада прыходзіць да чалавека, гатовая яго выслухаць і дапамагчы. І калі яшчэ ў 2008 годзе наш раён быў лідарам па колькасці зваротаў грамадзян у Гомельскай вобласці, то сёння колькасць скаргаў (а зварот – найчасцей менавіта скарга) знізілася на 30 %.

Безумоўна, такі паказчык – вынік работы не толькі назіральных камісій альбо інфармацыйных груп. Проста многае ў раёне сапраўды робіцца для таго, каб людзям жылося лепей, каб павышалася якасць жыцця і рос дабрабыт. Актыўна рамантуюцца дахі дамоў, аднаўляюцца і фарбуюцца фасады, добраўпарадкуецца тэрыторыя горада і сельскіх населеных пунктаў. Толькі за мінулае лета ў Мазыры было адрамантавана 40 кіламетраў вуліц – гэта вялікі аб'ём работ.

За кожным населеным пунктам раёна сёння замацаваны спецыялісты і кіраўнікі аддзелаў і службаў Мазырскага райвыканкама. Кожны з нас ведае, за якую вёску ён адказвае. Гэтае рашэнне забяспечвае раённай уладзе надзейную зваротную сувязь з насельніцтвам. Бо ёсць жа такія вёсачкі, у якіх засталося два-тры жыхары. Нават старшыня сельсавета не кожны тыдзень туды заедзе. А тут праз кожныя некалькі дзён з Мазыра патэлефануюць і пацікавяцца, ці прывезлі хлеб, ці расчысцілі своечасова дарогу. А калі адказная асоба яшчэ і наведае вёску, і самадзейных артыстаў з сабой прывязе – наогул свята атрымліваецца!

Ёсць тут і яшчэ адзін важны момант, пра які мы звычайна гаворым без ахвоты. Быццам саромеемся. Але ж многія з нашых адзінокіх вясковых пенсіянераў маюць у горадзе дзяцей! Дзяцей, якія абсалютна забываюцца, што бацькам трэба дапамагаць. І атрымліваецца парадокс: тут, у горадзе, гэта старанны і паважаны работнік, а для сваіх вясковых бацькоў – не надта дбайны сын ці дачка. Мы вынайшлі жорсткую, але надзвычай эфектыўную схему: на прадпрыемства прыходзіць ліст, у якім мы просім адпусціць на нейкі час работніка, бо ў небаракі проста няма часу наведаць бацькоў. Псіхалагічны эфект такога кроку каласальны.

У цэлым, на мой погляд, работа з людзьмі ў нашым раёне, ідэалагічная, выхаваўчая дзейнасць улады пастаўлены на сістэмныя рэйкі. Разам з поспехамі ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна, усёй краіны, павышэннем дабрабыту людзей такая работа прыносіць вялікі плён.

увагі. Чэмпіёнамі XXIX Алімпійскіх гульняў у Пекіне, напрыклад, сталі магістрант універсітэта Раман Петрушэнка і студэнт Артур Літвінчук. Прадстаўнікі гэтай ВНУ – прэтэндэнты ў трох намінацыях на прэмію «Трыумф. Героям спорту». Штогод з чэмпіянатаў свету і Еўропы спартсмены ўніверсітэта прывозяць не менш як 20 медалёў рознай вартасці. Сёння тут вучацца 18 майстроў спорту міжнароднага класа, 15 чалавек прэтэндуюць на тое, каб атрымаць ліцэнзіі на лонданскую Алімпіяду 2012 года.

Зрэшты, не толькі спортам высокіх дасягненняў ганарацца мазыране. У спартакіядах, якія праводзяцца тут па 10 відах спорту, удзельнічаюць і студэнты, і выкладчыкі, спаборнічаюць між сабой і інтэрнаты.




Мазырскія спартсмены, чэмпіёны свету па веславанні на байдарках і каноэ (злева направа): Артур Літвінчук, Раман Петрушэнка, Марына Палтаран, Дзмітрый Рабчанка, Дзяніс Гаража

Запатрабавана студэнтамі ўніверсітэцкая сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная служба: яна гатова прыйсці на дапамогу падчас сесій, пры ўзнікненні канфліктных сітуацый, даць параду маладым сем'ям. Праводзяцца як персанальныя кансультацыі, так і групавыя трэнінгі, напрыклад, па фарміраванні лідарскіх якасцей.

Вельмі цікавая задумка – факультатыў грамадскіх прафесій, аналагаў якому пакуль няма ў краіне. Студэнты вучацца, як займацца гуртковай работай, як далучаць дзяцей да сакрэтаў дэкаратыўна-прыкладнога, выяўленчага мастацтва, да спорту. І калі ў будучым малады педагог трапіць, напрыклад, у малакамплектную школу, з гэтымі ведамі ён зможа без праблем арганізаваць заняткі з вучнямі ў дадатковыя вучэбныя гадзіны.

– Вольны час моладзі, – перакананы Сяргей Шчур, – вельмі важная тэма ў справе выхавання, фарміравання асобы грамадзяніна і патрыёта. Адпускаць гэтую справу

МЕРКАВАННЕ



**Валянцін ВАЛЕТАЎ, рэктар Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П. Шамякіна, доктар біялагічных навук, прафесар:**

– Мы асаблівую ўвагу надаём ідэалагічнай і грамадска-палітычнай рабоце. Разглядаем гэтую задачу з тых пазіцый, што падрыхтоўка спецыяліста звязана не толькі з авалодваннем ім вузкапрафесійнымі ведамі, але і ў значнай ступені тым, як наш выпускнік умее карыстацца нормамі палітычных зносін і грамадскіх паводзін, ці здолелі яго выкладчыкі выхаваць грамадзянскую пазіцыю, пачуццё патрыятызму. Гэтыя найважнейшыя якасці мы лічым абсалютна неад'емнымі рысамі сапраўднага сучаснага спецыяліста.

У Беларусі створана моцная сістэма вышэйшай адукацыі. Стабільнасць нашага грамадства, дынамічнае развіццё краіны ў значнай ступені вызначаюцца тым, што на дзяржаўным узроўні менавіта пытанню ідэалагічнай работы надаецца належная ўвага. Да нас такое патрабаванне: каб у вышэйшых навучальных установах працавалі кафедры грамадскіх дысцыплін, навук сацыяльна-гуманітарнага кірунку, сацыяльнай педагогікі, гісторыі. І мы гэта робім, старанна і карпатліва шукаем кадры, якія маглі б забяспечыць універсітэтам выкананне гэтых важных дзяржаўных задач.

Калі мець на ўвазе практычную рэалізацыю ідэалагічнай работы, то лічу надзвычай важным, каб рэктар, іншыя прадстаўнікі адміністрацыі ВНУ былі ў пастаянным кантакце са сваімі студэнтамі і выкладчыкамі. Асабіста практычна кожны дзень бываю на факультэтах, сустракаюся са студэнтамі, заходжу ва аўдыторыі. Гавару з моладдзю пра нашы поспехі, пра задачы, якія стаяць перад намі ўсімі. Як дэпутат абласнога і раённага Саветаў я валодаю больш шырокай інфармацыяй пра становішча ў краіне, у нашым рэгіёне, і гэта заўсёды падабаецца студэнтам. Яны задаюць пытанні, я тлумачу спрэчныя моманты, і такім чынам негатыўныя з'явы, аспекты нейкай напружанасці ці непаразумення, якія маглі б з'явіцца, паспяхова здымаюцца.

Я асабіста прыхільнік прамога дыялога са студэнтамі. Напярэдадні важных палітычных падзей канца мінулага года сустракаўся практычна з усімі студэнтамі – у аўдыторыях, інтэрнатах. Нават з людзьмі, якія жывуць вакол універсітэцкага гарадка, меў гутаркі. Такая наша актыўнасць дае станоўчыя вынікі. І абсалютна мае рацыю Прэзідэнт краіны, калі гаворыць пра тое, што трэба сустракацца і размаўляць з людзьмі, глядзець ім у вочы. Размаўляць шчыра, пераканаўча, праўдзіва. І тады і студэнцкая моладзь, і педагагічны калектыў атрымліваюць пэўны зарад, належны імпульс энергіі і веры.

Пахваліцца нашаму ўніверсітэту сапраўды ёсць чым. У мінулым годзе, напрыклад, мы ўцяплілі інтэрнаты, адрамантавалі спартыўную залу, адкрылі новую трэнажорную залу, закупілі шмат новага спартыўнага абсталявання. Маладыя людзі, якія вучацца ў нас, гэтыя захады адміністрацыі ўніверсітэта бачаць.

Мы патрабавальна, але і добразычліва ставімся да кожнага нашага студэнта. Кожны з іх адчувае гэта і адказвае ўзаемнасцю. Наша работа сапраўды прыносіць бачны плён. Магу без залішняй сціпласці адзначыць, што ў плане грамадска-палітычнай работы наш універсітэт – адзін з самых арганізаваных сярод усіх ВНУ краіны.

на самацёк недаравальна – тады страчваецца магчымасць паўплываць на настрой і светапогляд студэнтаў.

А па-сапраўднаму таленавітым юнакам і дзяўчатам тут увагі ўдвая. Ва ўніверсітэце нават вядзецца рэестр талентаў, своеасаблівы кадравы рэзерв, куды трапляюць толькі адораныя, схільныя да творчасці альбо спорту студэнты.

– Мы шукаем маладых лідараў, – кажа прарэктар. – Гэта ж складана – знайсці чалавека, якому Богам дадзена быць лепшым. Для студэнта трапіць у гэтыя спісы – і прэстыжна, і ганарова, і карысна. А для ўніверсітэта – работа на перспектыву. Магчыма, гэтыя маладыя людзі з цягам часу стануць нашымі ж выкладчыкамі.

Дарэчы, у рэспубліканскім банку даных адоранай і таленавітай моладзі з Мазырскага педуніверсітэта ажно 16 чалавек – 5 выкладчыкаў, 2 аспіранты, 9 студэнтаў. Чацвёра студэнтаў за навуковую работу, актыўную грамадскую дзейнасць і выдатныя поспехі ў вучобе атрымліваюць прэзідэнцкія стыпендыі.

Работа з людзьмі не бывае простай. Нават па той прычыне, што надзвычай цяжка ацаніць яе плён. Ці зразумеў чалавек, ці ўспрыняў тое, што ідэолаг хацеў бы ўкласці яму ў душу? Крытэрыяў вымярэння правільнасці поглядаў, дасканаласці светаўспрымання няма. Толькі ў нейкія вызначальныя, пераломныя, крытычныя моманты па паводзінах чалавека можна зразумець, што ён думае, да чаго імкнецца, як ён ставіцца да той ці іншай з'явы грамадскага жыцця. Не крытычная, вядома, але малапрыемная сітуацыя не так даўно склалася ва ўсёй сістэме вышэйшай адукацыі краіны – ВНУ вымушаны былі падняць кошт навучання для студэнтаў-платнікаў. Мазыра гэтая праблема не мінула. Але тут яшчэ задоўга да новага года адміністрацыя правяла са студэнтамі шэраг сустрэч і з лічбамі і фактамі ў руках патлумачыла кожнаму неабходнасць гэтага, такога непапулярнага, кроку. Паабяцала, што ў студэнтаў і іх бацькоў не будзе праблем з растэрміноўкамі плацяжоў, з гнуткім графікам выплат і з індывідуальным падыходам да кожнага. Вынік? Падвышэнне цэн прайшло тут, як любяць іншы раз гаварыць чыноўнікі, без эксцэсаў. І гэта – якраз аб'ектыўны паказчык якасці работы з людзьмі.

## ЧАМУ ВУЧАЦЬ У ШКОЛЕ?

Ну, вядома ж, адымаць і памнажаць, як спяваецца ў вядомай песеньцы. Але ж не толькі веды ўкладваюцца ў дзяцей у нашых школах. Узрост да 18 гадоў – час фарміравання асобы, характару, светапоглядаў. І калі маёй першай рэакцыяй на прапанову галоўнага ідэолага раёна Таццяны Ганчарэнка наведаць школы быў яўны скептыцызм, то праз некалькі гадзін мне давялося памяняць сваю думку. Ідэалогія пачынаецца тут, у школе. Але ў Мазыры здолелі дасягнуць таго, каб работа з людзьмі не замыкалася ў школьных сценах, а распаўсюджвалася, пашыралася на мікрараён, на вёску, на горад і рэгіён у цэлым.

Якім чынам? Давайце паглядзім.

«Душа» адукацыйнай сістэмы Мазыршчыны – начальнік аддзела адукацыі райвыканкама Любоў Клепчукова. «Душа» – гэта не перабольшанне і не залішняе выкарыстанне прыгожага слоўца. Кіпучай энергіі, задору, няўрымслівасці і новых задумак Любові Сцяпанаўны хапае літаральна на ўсё – на вучняў, настаўнікаў, на ўвесь раён. Такія людзі, далібог, вялікая рэдкасць.

Галоўная заслуга Любові Клепчуковай у тым, што яна прымусіла альбо ўгаварыла (не гэта важна!) школы вынаходзіць і дзейнічаць, нават, магчыма, у нечым спаборнічаць паміж сабой. І тычыцца тое найперш не вучнёўскіх адзнак, а вучнёўскіх інтарэсаў, дзіцячага імпэту.

Кожная – удумайцеся, сапраўды кожная! – школа Мазыра і раёна шукае і знаходзіць свой кірунак, сваю, так бы мовіць, іскрынку. Школа № 8 – цэнтр дапрызыўнай падрыхтоўкі моладзі, № 9 – мастацка-эстэтычнага кірунку, школа пасёлка Крынічны – прыклад узаемадзеяння адукацыйнай установы з мясцовай уладай і органамі правапарадку.

А вось школа № 15 – узор гісторыка-патрыятычнага выхавання. Сёлета тут сумесна с Мазырскім педуніверсітэтам арганізоўваюцца пятыя ўжо Свята-Макар'еўскія чытанні – навукова-практычная канферэнцыя, у якой прымаюць удзел і вучні, і студэнты, і выкладчыкі ВНУ. Самыя цесныя сувязі наладжаны ў гэтай школы з Тураўскай епархіяй. Не на падмурку багаслоўя ці вывучэння Закона Божага, а на фундаменце высокай духоўнасці, светласці праваслаўнага светапогляду. Для Мазыршчыны супрацоўніцтва гэтай школы з царквой пяць гадоў таму было пілотным праектам, а сёння ў конкурсах, канферэнцыях, чытаннях, якія амаль кожны месяц ладзяцца ў горадзе пад эгідай епархіі, удзельнічае 80 % школ раёна. Не выпадкова ў лістападзе мінулага года школа № 15 атрымала імянны Ганаровы сцяг, на якім пазначаны высокі дэвіз «Вернасць Айчыне». Сцяг – знак асаблівай увагі, сімвал адраджэння лепшых традыцый рыцарскіх школ беларускага сярэднявечча – быў урачыста асвячоны ў мазырскім Свята-Міхайлаўскім кафедральным саборы Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі. Гэта –



Епіскап Тураўскі і Мазырскі Стэфан і дырэктар сярэдняй школы № 15 г. Мазыра Сяргей Траян (злева) на цырымоніі ўручэння Ганаровага сцяга кадэтам школы

грамадскае прызнанне заслуг школы ў выхаванні патрыётаў сваёй радзімы. Больш таго, у дагаворы, які падпісаны паміж школай і Акадэміяй МУС, гаворыцца, што грамадзянска-патрыятычнае і духоўнае выхаванне вучняў знаходзіцца пад асабістым патранатам епіскапа Тураўскага і Мазырскага Стэфана.

Справа ў тым, што з 840 вучняў школы больш як 200 прыходзяць на заняткі ў вайсковай форме. З пятага па восьмы клас дзеці маюць магчымасць вучыцца ў кадэцкіх класах, а пасля, у старшай школе, кадэты могуць выбраць паміж юрыдычнымі класамі і класамі падрыхтоўкі да службы ў структурах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

– Форма дысцыплінуе, дадае дзецям годнасці, сур'ёзнасці, – канстатуе дырэктар

школы Сяргей Траян. – Яна прымушае да іншага стылю паводзін. Уяўляеце, як адчувае сябе шаснаццацігадовы хлапчук, калі ідзе па горадзе ў форме, а ў кішэні мае пасведчанне, якое дазваляе яе насіць?

І вось красамоўны факт – сярод дзяцей у пагонах абсалютна няма падлеткавай злачыннасці. Затое выпускнікі школы сёння ёсць сярод навучэнцаў Акадэміі МУС, Інстытута пагранічнай службы, навучальных устаноў МНС, юрыдычных факультэтаў многіх ВНУ.

Сяргей Вячаслававіч на развітанне прызнаўся, што вядзецца падрыхтоўка да таго, каб афіцыйна замацаваць за вопытам школы назву «Сістэма выхаваўчай работы «Мазырскі кадэцкі корпус».

А вось школа № 14 здзіўляе іншым напрамкам – увагай да экалогіі і энергазберажэння. Два гады таму школа выйграла рэспубліканскі конкурс экалагічнага выхавання і атрымала падарунак ад Сусветнага банка – сучасныя энергазберагальныя вокны. Праз год школьная агітбрыгада стала лепшай у краіне – і былі ўстаноўлены энергазберагальныя лямпы. Цяпер школа на поўным сур'ёзе збіраецца выйграваць чарговы конкурс і ў якасці прыза атрымаць уцяпленне сцен сучаснымі матэрыяламі па сучасных тэхналогіях.

– У мяне да гэтай школы асаблівыя адносіны, – прызнаецца начальнік аддзела адукацыі райвыканкама. – Тут вельмі моцная выхаваўчая работа. Яны актыўна працуюць з соцыумам. У калектыву цесная сувязь з насельніцтвам мікраараёна, з прадпрыемствамі горада і аграгарадкамі, з дэпутацкім корпусам і ідэалагічным аддзелам выканкама.

Школьная газета, штомесячныя экалагічныя акцыі, мультымедыйныя прэзентацыі, канцэрты вучнёўскай агітбрыгады – пералічыць усе формы работы з дзецьмі тут проста немагчыма.



Дырэктар тэлеканала «Мазыр» Юрый Каплан атрымлівае статуэтку нацыянальнага конкурсу «Тэлевяршыня» за лепшую ў краіне праграму навін рэгіянальнага тэлебачання

Напрыклад, кожны клас бярэ якое-небудзь з прадпрыемстваў горада. Два месяцы дзеці вывучаюць яго, знаёмяцца з тым, як дарослыя працуюць, як эканомяць энергарэсурсы, што выпускаюць і дзе гэта прадаецца. А потым рыхтуюць прэзентацыі для агульнашкольных сходаў.

– Мы, шчыра кажучы, павінны выгадаваць сапраўднага грамадзяніна і дбайнага работніка, – лічыць Любоў Клепчукова. – Такая форма работы з дзецьмі, актыўны ўдзел школьнікаў у вывучэнні эканомікі горада, далучэнне з маленства да разумення важнасці беражлівых адносін да энергарэсурсаў – гэта, я лічу, самая лепшая і пераканаўчая прафесійная і грамадзянская арыентацыя.

Не стамляецца здзіўляцца са сваіх вучняў і дырэктар школы Алена Прыбышчук. «Не так даўно пяцікласнікі раптам зацікавіліся чысцінёй нашага горада, – распавядае Алена Уладзіміраўна. – Адшукалі звалкі, сфатаграфавалі горы смецця на задворках, у ярах, потым правялі анкетаванне сярод жыхароў мікраараёна – і падрыхтавалі цудоўны матэрыял, які мы паказалі ўсёй школе на піянерскім сходзе. Рэзананс у горадзе атрымаўся такі, быццам пра гэтую праблему па тэлебачанні паказалі!»

## ТРАПІЦЬ НА ТБ

Тэлеканал «Мазыр» не выпадкова аказаўся ў планах майго знаёмства з горадам. Непасрэдна да ідэалагічнай работы з моладдзю тэлебачанне справы быццам бы і не мае, але менавіта ТБ – асноўная крыніца інфармацыі для многіх маладых.

Дырэктар тэлеканала Юрый Каплан толькі вярнуўся з выезду ў горад: вадзіцель рэдакцыі зламаў нагу, таму дырэктару даводзіцца вазіць здымачныя групы на сваёй машыне. «А што зробіш? – паціскае плячыма Юрый Ашэравіч. – Наш штодзённы 20-хвілінны вячэрні выпуск навін ніхто не адмяняў».

У гэты дзень журналісты тэлеканала працавалі ва ўніверсітэце, здымалі нейкае студэнцкае мерапрыемства, потым – у міліцыі, дзе праводзілася прафілактычная гутарка з правапарушальнікамі. Пасля група заехала ў пашпартна-візавую службу – бамжу, які нечакана прыбыўся ў Мазыр,

пасля праверкі ўрачыста ўручалі пашпарт, а кіраўніцтва горада паабяцала знайсці для яго які-небудзь прытулак, напрыклад у інтэрнаце. Урэшце, праводзілі тэлеапытанне сярод жыхароў: цікавіліся, як людзі ставяцца да ініцыятывы мясцовай улады аб сумесным фінансаванні рамонту пад'ездаў – каб палова кошту аплочвалася з бюджэту, а другая палова – самімі жыхарамі.

– Справа ў тым, што дагэтуль у грамадстве па многіх пытаннях пануюць спажывецкія настроі, маўляў, дзяржава мне павінна... – тлумачыць дырэктар тэлеканала. – А самі вы прыкладаеце хоць якія-небудзь намаганні да таго, каб жыць па-чалавечы, каб падтрымліваць хоць бы для сябе элементарны парадак у пад'ездзе? Мы зрабілі ўжо некалькі сюжэтаў на гэтую тэму. Паказваем прыклады станоўчыя, дэманструем і жудасныя карцінкі. Трэба паціху мяняць псіхалогію людзей.

Акрамя выпуску штодзённых навін, тэлеканал робіць яшчэ шэраг праграм. «Дыялог» – гэта абмеркаванне набалелых праблем раёна ў прамым эфіры з адказным прадстаўніком якой-небудзь службы выканкама, адказы на званкі гледачоў. «Вынікі тыдня» – аналіз самых вострых і рэзанансных падзей. А яшчэ – «Па-за законам», «Рэгіён ТБ», «Спецыяльны рэпартаж», «Свята кожны дзень»...

– Я лічу, што для Мазыра столькі праграм – больш чым дастаткова, – усміхаецца Юрый Ашэравіч. – А кіраўніцтва раёна лічыць, што трэба яшчэ больш. Таму і тэлефануе мне кожную раніцу начальнік ідэалагічнага аддзела выканкама Таццяна Міхайлаўна Ганчарэнка, спаць не дае!

Але гэта, вядома, жарт. А на поўным сур'ёзе дырэктар мазырскага тэлебачання гаворыць пра тое, як уважліва глядзяць у горадзе праграмы свайго ТБ. Больш за 34 тысячы сем'яў атрымліваюць карцінку мясцовай студыі, і ні на дзень не аціхаюць тэлефоны тэлеканала.

– Людзі ўвесь час нам тэлефануюць, – гаворыць Юрый Каплан. – Расказваюць, што дзе адбылося, скардзяцца, калі нешта не так. А мы знімем – і ў эфір. Вечарам пакажам, а ранкам, на аператыўнай планёрцы ў выканкаме, пачынаюцца разборкі, хто вінаваты ў паказанай па ТБ сітуацыі і калі яна будзе выпраўлена. Многія чыноўнікі з хваляваннем вечарам глядзяць мясцовыя навіны. Затое жыхары горада нам удзячныя – эфектыўнасць сумеснай работы мясцовага тэлебачання і ўлады відавочная.

Урачыстая закладка Алеі ветэранаў ля сярэдняй школы № 14 г. Мазыра



Між іншым, пра якасць праграм тэлеканала «Мазыр» лепш за ўсё сведчыць статуэтка, якая ўручаецца пераможцам нацыянальнага конкурсу «Тэлевяршыня». У мінулым годзе было прызнана, што менавіта тут, у Мазыры, робяць лепшыя ў краіне праграмы навін рэгіянальнага тэлебачання.

***

Таццяна Міхайлаўна Ганчарэнка, якая суправаджала мяне ў паездках па раёне, усё перажывала, што не ў той час завітаў журналіст у Мазыр.

– Вось прыехалі б вы на свята горада, напрыклад, – даводзіла яна, – паглядзелі, колькі чалавек удзельнічае ў нашым святкаванні. Прытым не проста як гледачы. Які ў нас фэст ладзіцца! Былы кіраўнік Гомельшчыны Аляксандр Серафімавіч Якабсон, калі пабываў у нас на свяце, не пераставаў здзіўляцца. Маўляў, вы, мазыране, – унікальныя людзі: палова горада на сцэне, палова – гледачы.

Ні на хвілінку не сумняваюся, што так яно і ёсць. У Мазыры прадстаўнікі ўлады навучыліся, здолелі дасягнуць галоўнага – наблізіцца да людзей, пачуць іх і аб'яднаць. Відавочна, што і на ўзроўні краіны гэтая работа атрымала належную ацэнку: не так даўно, як вядома, былы кіраўнік раёна Уладзімір Андрэевіч Дворнік быў прызначаны старшынёй Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта.

Без належнага падыходу да ідэалагічнай работы, без стараннай і мэтанакіраванай працы з людзьмі і дзеля людзей дасягнуць тых поспехаў, якімі сёння па праву ганарыцца Мазыршчына, было б немагчыма.

Адным словам, сістэма!

**Максім ГІЛЕВІЧ**